Адзел адукацыі, спорту і турызму  Асіповіцкага райвыканкама
Дзяржаўная ўстанова адукацыі "Сярэдняя школа №3 г. Асіповічы"

Конкурс навукова-даследчых і творчых работ на тэму
"Памяць роду: мінулае вачыма сучаснікаў"

Тэматычны накірунак "З гісторыі родных мясцін"

# Маршрутам Памяці


**Аўтар:**
**Рышкевіч  Валерыя Уладзіміраўна**, 9 *клас*
*ДУА «Сярэдняя школа №3 г. Асіповічы»*

**Кіраўнік:**
**Жаўрыд Клаўдзія Канстанцінаўна,**
*настаўнік беларускай мовы і літаратуры*
*вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі*

*Адрас установы адукацыі:*
*Рэспубліка Беларусь, 213761,*
*Магілёўская вобласць, г. Асіповічы,*
*вуліца Горкага, 4а ,*
*тэл./факс: 802235-22113,*
*маб. (+37529)3684459*
*Дзяржаўная ўстанова адукацыі*
*"Сярэдняя школа №3 г. Асіповічы",*

*Хатні адрас:*
*Рэспубліка Беларусь, 213761,*
*Магілёўская вобласць, г. Асіповічы,*
*вуліца Чкалава, д.1, кв.40  ,*
*тэл: 802235-70250,*
*маб. (+37544)7195110*
*E-mail: Rishkevich19@mail.ru*


Асіповічы, 2016

# УВОДЗІНЫ

Эфектыўным сродкам выхавання навучэнскай моладзі з'яўляецца краязнаўства, роля і перспектывы якога пастаянна ўзрастаюць. Гэта звязана ў першую чаргу з канцэпцыяй выхавання на гісторыі Бацькаўшчыны, на краязнаўчым матэрыяле родных мясцін, культурнай спадчыне народа.

Сёння вызначаюцца новыя перспектывы комплекснага вывучэння гістарычнага мінулага ва ўсіх яго праяўленнях, далучэння моладзі да духоўных крыніц народа. У гэтай рабоце вялікае месца адводзіцца духоўнаму ўзбагачэнню асобы праз далучэнне да гісторыка-культурнай і духоўнай спадчыны краю, фарміраванню каштоўнасных арыенціраў, гонару і павагі да гісторыі роднага краю.

У рамках дадзенага праекта створана нітка маршрутузнавучальным эфектам, якая рэальна дзейнічае з выкарыстаннем мясцовага матэрыялу перыяду ВялікайАйчыннай вайны. Нітка маршруту Памяці экскурсіі Асіповічы - Верайцы – Дражня адлюстравана на малюнку 1 (дадатак 1).

Правядзенне турысцкіх паходаў па дадзенаму маршруту сталі асновай для збору матэрыялупа гісторыі роднага краю.

Аповед па дадзенаму маршруту Памяці прызначаны для шырокага круга чытачоў, якія цікавяцца краязнаўствам.

Дадзены матэрыял можна выкарыстоўваць на класных гадзінах і пазакласных мерапрыемствах, прысвечаных падзеям Вялікай Айчыннай вайны.

# АПОВЕД ПА НІТЦЫ МАРШРУТУ

У гэтым годзе наша краіна адзначае 71-гадавіну Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Хоць прайшоў 71 год, але многае аб вайне мы не ведаем. І пагэтаму мы вырашылі даведацца пра тыя падзеі больш. Наш шлях ляжыць у вёску Дражня Асіповіцкага раёна Магілёўскай вобласці (мал. 2, дадатак 1).

Чаму ў гэтую вёску? Тут існуе добрая традыцыя: 9 Мая дзеці і ўнукі прыязджаюць на могілкі і ўскладваюць кветкі да помнікаў тых, хто ваяваў (іл.7, дадатак 2). І гэта не дзіўна: вёска адправіла на вайну больш за пяцьдзясят чалавек! Не вярнулася дадому трынаццаць!

1. Баешка Уладзімір Мартынавіч, 1921г.н.
2. Бурачэўскі Іосіф Іосіфавіч,1900г.н.
3. Бярнат Кузьма Паўлавіч,1918г.н.
4. Вернікоўскі Канстанцін Іосіфавіч,1915г.н.
5. ЗлобічДзмітрый Мацвеевіч,1919г.н.
6. Злобіч Мікалай Іванавіч, 1924г.н.
7. Мастовіч Адам Пятровіч,1913г.н.
8. Рымашэўскі Канстанцін Якаўлевіч, 1922г.н.
9. Савайтан Дзмітрый Усцінавіч, 1922г.н.
10. Сачок Піліп Іванавіч, 1906г.н.
11. Сугака Антон Пятровіч,1898г.н.
12. Сугака Іван Фёдаравіч,1918г.н.
13. Толкач Васіль Сідаравіч.

І так кожны год 9 мая бабуля наведвае магілу свайго бацькі, а майго прадзеда, Канстанціновіча Станіслава Уладзіміравіча, і ўскладае кветкі да помніка на яго магіле. З успамінаў бабулі я ведаю, што прадзед да вайны служыў у арміі і адтуль трапіў на фронт. Свой першы бой прыняў пад Магілёвам. У гэтым баі быў кантужаны, трапіў у шпіталь. Пасля выздараўлення вярнуўся ў свой полк, дзе працягваў ваяваць за Радзіму. Мой прадзед служыў у разведроце, неаднаразова хадзіў у тыл ворага, браў “языка”. Прадзед

ўзнагароджаны баявымі медалямі,але найбольш ён ганарыўся медалём "За адвагу". Перамогу сустрэў у Берліне (іл. 11, 12, 13, дадатак 3)

Вось я і падумала, што вельмі цікава прайсціся маршрутам Памяці і наведаць сем'і аднавяскоўцаў маёй бабулі, якія ваявалі і даведацца, хто ваяваў і вярнуўся з Перамогай, а хто застаўся ляжаць на полі бою, аддаўшы жыццё за наша светлае будучае.

Прыехаўшы электрычкай на станцыю Верайцы, мы наведалі брацкую магілу і даведаліся, што тут пахаваны Герой Савецкага Саюза Абросімаў М.Р., які загінуў пры вызваленні Асіповіччыны. Далей мы наведалі брацкую магілу на Перарожкаўскіх могілках, дзе пахаваны воіны Савецкай Арміі, якія загінулі пры вызваленні гэтай мясцовасці (іл. 1-6, дадатак 2).

А вось і вёска Дражня (іл.8-10, дадатак 2).

Першы пункт нашага маршруту Памяці - дом Губар Марыі Іванаўны. Яна расказала нам, што з сям'і Злобіч (родных і стрыечных) на вайну пайшлі дзесяць чалавек!

Злобіч Дзмітрый Мацвеевіч

Злобіч Уладзімір Мацвеевіч

Злобіч Канстанцін Мацвеевіч

Злобіч Мікалай Іванавіч

Злобіч Канстанцін Іванавіч

Злобіч Васілій Васільевіч

Злобіч Канстанцін Васільевіч

Сугака Іван Фёдаравіч

Сугака Мікалай Фёдаравіч

Сугака Аляксей Фёдаравіч.

Не вярнулася трое: Злобіч Дзмітрый Мацвеевіч, Злобіч Мікалай Іванавіч, Сугака Іван Фёдаравіч. Вечная ім памяць! Астатнія, слава Богу, вярнуліся і пражылі сумленнае жыццё. Іх ужо няма, але памяць пра іх жыве, дзякуючы дзецям і ўнукам.

Гісторыя жыцця наступных герояў нашага маршруту вельмі нас уразіла. Гэта Канстанціновіч Якаў Якаўлевіч, стрыечны брат майго прадзеда, і яго жонка, Канстанціновіч Сафія Цімафееўна. Яны пазнаёміліся ў шпіталі, куды па раненні трапіў Якаў Якаўлевіч і дзе працавала медыцынскай сястрой Сафія Ціханаўна. Пасля выздараўлення Якава Якаўлевіча яны развіталіся,але пасля вайны Якаў Якаўлевіч знайшоў сваю каханую, і ўжо мужам і жонкай яны вярнуліся ў Дражню. Якаў Якаўлевіч служыў у кавалерыйскім палку ветфельчарам, закончыў вайну ў Германіі, а Сафія Ціханаўна са сваім медсанбатам дайшла да Берліна і там сустрэла Перамогу. Пасля вайны яна працавала Ў Асіповіцкай раённай бальніцы медыцынскай сястрой, а Якаў Якаўлевіч – ветурачом у саўгасе “Пратасевічы” (іл.14, 15,16, 17, дадатак 3).

Гэтую гісторыю нам паведаміў пляменнік Сафіі Ціханаўны, Ігар Шаламаў.

Суседзямі Канстанціновіч былі Жлобіч Фёдар Піліпавіч і Таццяна Макараўна, таксама былыя партызаны. Партызанілі яны на Гомельшчыне, дзе і пажаніліся. У доме ніхто не жыве, але нам пашанцавала: прыехала унучка, Жлобіч Святлана Іванаўна. Яна расказала нам адзін эпізод з партызанскага жыцця дзядулі і бабулі. Немцы акружылі партызанскі атрад. Пасля прарыву блакады Фёдар Піліпавіч пайшоў з войскам вызваляць ад ворага нашу Радзіму. А Таццяна Макараўна знаходзілася ў сямейным партызанскім лагеры, так як чакала нараджэння дзіцяці. Сямейны лагер захапілі немцы, і ў гэты час нарадзіўся хлопчык, якога назвалі Фёдар, таму што існаваў негалосны закон: дзяцей,народжанных у атрадзе, называлі імем бацькоў. Таццяну Макараўну ледзь не застрэлілі за тое, што яна доўга не выходзіла з зямлянкі, але яе абаранілі жыхары сямейнага лагера. У хуткім часе іх вызвалілі партызаны, якія выйшлі з акружэння. Жанчына не ведала, што з яе мужам і разам з маленькім сынам прыехала ў вёску Дражня, дзе жылі бацькі мужа. Тут і стала вядома, што Фёдар Піліпавіч з баямі дайшоў да Польшчы. Там быў паранены і пасля шпіталя вярнуўся дадаму, дзе і сустрэўся з сям’ёй (іл.22-27, дадатак 4).

Далей наш маршрут ляжаў да дома Сасіновіча Міхаіла Уладзміравіча, інваліда, ветэрана Вялікай Айчыннай вайны. Мы ўбачылі ў двары яго дачку, Барысевіч Ніну Міхайлаўну. Яна нам расказала, што Міхаіл Уладзіміравіч пайшоў на вайну ў 1944 годзе, пасля вызвалення Асіповіччыны. Дайшоў да Польшчы, зімой 1945 быў паранены. У выніку ранення застаўся без нагі. Пасля вайны працаваў шаўцом  у вайсковай часці 31967. Выхаваў трох дачок. Быў вельмі вясёлым, добрым, сумленным чалавекам (іл.18,19, дадатак 3).

Наступны дом, куды мы завіталі, - гэта дом Грышановіча Івана Паўлавіча іЛідзіі Іванаўны. Зараз тут жыве іх дачка, Гарбацэвіч Галіна Іванаўна. Іван Паўлавіч і Лідзія Іванаўна змагаліся зворагам у партызанскім атрадзе імя Сумчанкі злучэння Каралёва. Іван Паўлавічбыў камандзірам гаспадарчага ўзвода, а Лідзія Іванаўна – партызанкай. Незадоўга да вызвалення Лідзія Іванаўна была цяжка паранена. У выніку ранення ў яе аднялі руку. Пасля вызвалення Іван Паўлавіч узначальваў калгас “Бальшавік” Пратасевіцкага сельскага савета, а Лідзія Іванаўна выхоўвала дзяцей, траіх сыноў, дачку, і займалася хатняй гаспадаркай (іл.28-31, дадатак 4).

У вёсцы Дражня можна было б заходзіць у любы дом, дзе жылі ўдзельнікі вайны (а гэта практычна ўсе дамы), але, на жаль, не ва ўсіх дамах жывуць іх родныя і блізкія.

І апошнім пунктам нашага маршруту Памяці з’яўляецца дом Чорнага Фёдара Паўлавічаі Вольгі Рыгораўны, якія ў гады вайны былі партызанамі 161-й брыгады імя Катоўскага. Фёдар Паўлавіч-партызан, а Вольга Рыгораўна – сувязная атрада, потым ваявала ў атрадзе. Цікава тое, што ажаніліся яны ў партызанскім атрадзе і рэгістравалі іх у атрадзе. Учас выхаду зблакады чатыры дні сядзелі ў Верхаўскім балоце. Але ўсё закончылася добра. Нашы героі вярнуліся ў Дражню. Фёдар Паўлавіч працаваў на чыгунцы, а Вольга Рыгораўна – даяркай на ферме вёскі Дражня саўгаса “Пратасевічы” (іл.32-34, дадатак 4).

У доме бацькоў жыве іх дачка, Раткавец Валянціна Фёдараўна, якая беражна захоўвае фотаздымкі, дакументы і памяць пра бацькоў, якіх ужо няма

Маршрут Памяці закончаны. Мы даведаліся пра тую невялікую частку людзей, якія абаранялі нашу Радзіму ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Не ўсе яны занесены ў Кнігу Памяці, але мы павінны ведаць пра іх чалавечы подзвіг.

Я спадзяюся, што мы вернемся ў гэтую вёску яшчэ, працягнем нашу экскурсію і раскажам пра астатніх землякоў.

Вы спытаеце, навошта мы гэта робім? Я адкажу.

Па-першае, гэта сувязь пакаленняў.

Па-другое, гэта мая асабістая зацікаўленасць гісторыяй роднага краю і народа.

Па-трэцяе, гэта ўнутраная неабходнасць ушанаваць тых, хто яшчэ жывы сведка тых гераічных падзей.

У мінулым годзе мы наведвалі апошняга жывога ўдзельніка Вялікай Айчыннай вайны - Бурачэўскага Уладзіміра Уладзіміравіча, ураджэнца вёскі Дражня. Уладзімір Уладзіміравіч быў прызваны ў Савецкую Армію ў 1944 годзе і залічаны ў 73-ю Незабытоўскую ордэна Леніна Чырванасцяжную ордэна Суворава стралковую дывізію. У яе складзе прайшоў шлях да заліва Фрышэс-Хафа, што на узбярэжжы Балтыйскага мора. Быў параненыў нагу ў Польшчы пад горадам Макаў. У шпіталі праляжаў два месяцы, затым быў накіраваны ў школу сяржантаў. Вучыўся ў франтавых умовах. Знаходзячыся на фронце, часта хадзіў у разведку. У Германіі выратаваў 15 салдат, якія трапілі ў засаду. У сямейным архіве Уладзіміра Уладзіміравіча беражна захоўваецца чырвонаармейская кніжка, медалі “За адвагу”, “За ўзяцце Кінінсберга”, “За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941-1945 г.г., ордэн Айчыннай вайны I ступені, самаробная кніга з апісаннем пройдзенага шляху яго стралковай дывізіі. Да 60-годдзя вызвалення Беларусі яму была ўручана інкрусціраваная саломкай, зробленая з дрэва грамата. Ёсць і працоўная ўзнагарода- грамата Вярхоўнага Савета БССР за працоўныя поспехі ў пасляваенны час (іл.20,21, дадатак 3).

На вялікі жаль 26 студзеня 2016 года Уладзіміра Уладзіміравіча не стала.

Закончыць сваю экскурсію я хачу вершам нашай зямлячкі Лёлі Багдановіч “Усамотным палёце хвілін…”

Перамогу святкуе краіна,
Пражылі сем дзясяткаў гадоў
У спакоі, у шчасці і ў міры
У блакіце вясёлкавых сноў..

Толькі памяць прашые карцеччу
Адгалосак крывавых падзей,
Што жыццё назаўжды пакалечыў
Самых блізкіх і родных людзей.

Калі промнні салюта расквецяць
Небасхіла бяздонную плынь
І ўсхліпне ў роспачы Вечнасць
У самотным палёце хвілін,

Мы герояў успомнім пайменна
І паклонімся ім да зямлі.
Поплеч з намі і ўчора, і сёння –
І заўсёды яны ў страі!

## ЛІТАРАТУРА

1. Газета “Асіповіцкі край” №44 ад 7 чэрвеня 2013 г. с.3.
2. Газета “Асіповіцкі край” №35 ад 8 мая 2015 г. с.5-6.
3. Памяць. Асіповіцкі раён. Мінск БелТА. 2002, с-251-559.

ДАДАТАК 1

## НІТКА МАРШРУТУ ПАМЯЦІ

(Асіповічы – Верайцы – Дражня)




Мал. 1 – *Нітка экскурсіі па маршруце Памяці*




*Мал.2 – Карта-схема тэрыторыі вёскі Дражня*

ДАДАТАК 2

# АБ’ЕКТЫ МАРШРУТУ ПАМЯЦІ




*Іл. 1* ***-Асіповіцкі вакзал***



*Іл. 2* **- *Чыгуначная ветка Асіповічы-Мінск***



*Іл. 3* ***-Вакзал ст. Верайцы***



*Іл. 4* ***–Верайцы. Помнік партызанам і падпольшчыкам (1941-1945)***



*Іл. 5* ***– Верайцы. Помнік героям Вялікай Айчыннай вайны (1941-1945)***



*Іл. 6* ***-Помнік салдатам, паўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны (1941-1945)***

Працяг дадатку 2







*Іл. 7* -***Нашчадкі ўшаноўваюць памяць***

*Іл. 8* - ***Вёска Дражня – галоўны прыпынак экскурсіі***





*Іл. 9, 10* -***Спадчына герояў нашага аповеду***

ДАДАТАК 3

## ЗЕМЛЯКІ-ФРАНТАВІКІ



*Іл. 11–**Дом, дзе жыў КанстанціновічСтаніслаўУладзімірав іч***



*Іл. 12 -* ***Канстанціновіч Станіслаў Уладзіміравіч***



*Іл. 13 -**Канстанціновіч Станіслаў Уладзіміравіч.***

***Здымак адразу пасля вайны***





*Іл. 14, 15–**Дом, дзе жылі Канстанціновіч Якаў Якаўлевіч і Канстанціновіч Сафія Цімафееўна***



*Іл. 16* - ***Канстанціновіч Якаў Якаўлевіч, Канстанціновіч Сафія Цімафееўна***



*Іл.17* - ***Канстанціновіч С.Ц. (другі рад, трэцяя злева) у саставе медперсаналу – дайшлі да Берліна***



Іл. 18–***Дом, дзе жыў Сасіновіч Міхаіл Уладзміравіч***



Іл. 19 - ***Сасіновіч Міхаіл Уладзміравіч***



*Іл.20*–***Дом Бурачэўскага Уладзіміра Уладзіміравіча***



*Іл. 21* - ***Бурачэўскі Уладзімір Уладзіміравіч***

ДАДАТАК 4

## ЗЕМЛЯКІ-ПАРТЫЗАНЫ





*Іл. 22, 23 –* ***Дом, дзе жылі Жлобіч Фёдар Піліпавіч і Жлобіч Таццяна Макараўна***





*Іл. 24, 25 –* ***Жлобіч Фёдар Піліпавіч і Жлобіч Таццяна Макараўна***





*Іл. 27* - ***У час сустрэчы ветэранаў***

***9 мая 2003 г.***

*Іл. 26* - ***Жлобіч Ф.П. і Жлобіч Т.М.***

***(58 гадоў разам)***





*Іл. 28, 29*–***Дом, дзе жылі Грышановіч Іван Паўлавіч і Лідзія Іванаўна***





*Іл. 30, 31* - ***Грышановіч Іван Паўлавіч і Лідзія Іванаўна***



*Іл. 32–**Дом, дзе жылі Чорныя Фёдар Паўлавіч і Вольга Рыгораўна***





*Іл. 33,34 - **Чорны Фёдар Паўлавіч і Вольга Рыгораўна***